**УДК 94(476)”17”**

# ДЗВІНСКІ ГАНДЛЬ І ЯГО ПАДАТКААБКЛАДАННЕ Ў ПАЧАТКУ XVII СТАГОДДЗЯ

***канд. гіст. навук В.У. ЯКУБАЎ***
***Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт***
***v.yakubau@psu.by***

*Разглядаецца гандль і падаткаабкладанне мяшчан і шляхты Беларускага Падзвіння і Падняпроўя па шляху ў Рыгу і назад. На падмурку першакрыніц аналізуецца змест таваразвароту экспарта і імпарта, сацыяльны статус удзельнікаў гадлю. Робіцца выснова аб заняпадзе полацкага рачнога флоту, адноснай роўнасці памераў і наменклатуры тавараў шляхецкага і мяшчанскага гандлю, ужыванні тэрміна “пан” адносна мяшчан і аб існаванні у XVII ст. шчыльнай узаемасувязі паміж кормнікамі Полацка, Віцебска, Чашнікаў і купецтвам Лепеля, Оршы, Шклова, Магілева, Рагачова, Рэчыцы, што стала адной з прычын стварэння самастойнага рэгіёна з назвай Белая Русь.*

***Ключавыя словы**: гандль, падаткаабкладанне, Беларускае Падзвінне.*

**Уводзіны.** Пры разглядзе пытанняў сацыяльна-эканамічнай гісторыі беларускіх земляў аднымі з найбольш важных тэмаў з’яўляюцца транспартныя перавозкі і гандль, якія забяспечвалі штодзённыя патрэбы насельніцтва і злучалі рэгіёны паміж сабой. Нягледзячы на важнасць тэмы, асобных навуковых распрацовак пасля вялікіх абагульняючых прац А. Сапунова [1], З. Капысскага [2–3], В. Мялешкі [4–5] В. Дарашэнкі [6], асобных артыкулаў, прысвечаных гандлю падзвінскіх гарадоў у пачатку XVII ст. не было. Адным з тыпаў крыніц, якія асвятляюць эканамічнае жыццё у ранні Новы Час, з’яўляюцца кнігі квітоў мытняў. Рыжскі архіў выдатна прапрацаваны В. Дарашэнкам, але полацкія, гарадзенскія і берасцейскія мытныя кнігі са збораў бібліятэкі Віленскага ўніверсітэта [7–10] ніхто з айчынных гісторыкаў, акрамя В. Мялешкі, не выкарыстоўваў. Але ён працаваў пераважна над эканамічнай гісторыяй Магілёва, А. Сапуноў – Віцебска, В. Дарашэнка – Рыгі, таму цэлы шэраг пытанняў рэгіянальнай і інстытуцыянальнай гісторыі застаўся ў гэтых не асветленым і патрабуючым удакладнення.

**Асноўная частка.** Сфармаваныя ў Сярэднявеччы дзвінскі гандль і інфраструктура па яго абслугоўванні, як і дзяржаўныя ўстановы па яго кантролі, працягвалі існаваць і развівацца ў Новы час. Кожны буйны горад меў мытную камору, якая фіксавала колькасць і памер тавара, узважвала яго, абкладала падаткамі (“паборавала”), выдавала квіткі аб выплаце з рэкамендацыямі, што рабіць наступным паборцам, калі тавар будзе дагружацца ці змяншацца. Каморам падначальваліся прыкаморкі. На дзвінскім водным шляху найбольш важнымі былі прыкаморкі ў Дынабургу і Дзісне, якія актыўна функцыянавалі летам і разгружалі асноўныя каморы ў Полацку і Рызе [7, с. 33, 11, 12]. Дзеля таго, каб гандляры не абышлі мытні па дробных рэчках, мыта з купцоў, якія ішлі ці вярталіся з Рыгі, збіралася на сутоках з Дзвіной і яе прытоках: у Друі, Сар’і, Дрысе і Дзісне. У XVI ст. Друя была вядучым прыкаморкам для тавару, які ўвозіўся ў ВКЛ [13, с. 46], але з уваходжаннем Інфлянтаў у склад Рэчы Паспалітай і адбудовай Дынабургу ў 1582 г. апошні перахапіў статус галоўнага мытнага пункту на выхадзе з Лівоніі ў ВКЛ, і рэестр 1616 г *ні разу* не ўзгадвае аб мытні ў Друі. Паводле подпісу 1552 г., там бралося мыта з кожнага струга грашыма (4 грошы з бочкі селядцоў “на караля”, 10 грошай са струга “на ваяводу полацкага”) ці натурай (напрыклад, па два селядцы “на ваяводу полацкага”, ці часткамі тавара: кружкоў воска, соллю, скурамі, металам і іншым) [13, с. 46–47]. Вышэй па плыні мытныя прыкаморкі на Дзвіне існавалі ў Суражы, Віцебску, а ніжэй – у Кокенгаўзе, Крыжборгу (Крэйцбургу), Дынамюндзе, дзе купцы плацілі “замкавае”, “старое”, а ў часы войнаў 1600–1629 гг. – “дадатковае” і “новае падвышанае” мыта [14, с. 435] – і гэта толькі афіцыяльныя падаткі і зборы. Разам з тым каморнікі маглі даць гандляру права безмытнага правозу тавара.

Існаванне ўнутраных мытняў было выгадна для Радзівілаў і Сапегаў, кліенты якіх у гэты перыяд займалі вядучыя адміністрацыйныя пасады на землях у сярэднім цячэнні Дзвіны [15]. Біржанскія Радзівілы трымалі Кокенгаўзен, а вялікі канцлер ВКЛ Леў Сапега з невялікімі прерапынкамі ўвесь пачатак XVII ст. атрымліваў прывілеі на арэнду мыта ВКЛ і перапрадаваў кантроль над мытнямі сваім субарэндатарам, якія атрымлівалі з пасады максімум выгод для сябе. Зімой 1599 г. злоўжыванні мытных чыноўнікаў сталі прычынай пагроз шляхты Полацкага, Віцебскага і “іншых рускіх ваяводстваў” выклікаць Л. Сапегу і К. Радзівіла позвамі ў суд [16, с. 224]. Злоўжыванні насілі характар сістэмнай заганы і таму працягваліся. Так, дзісенскі магістрат абвінаваціў у неабаснаванай канфіскацыі тавараў (8 бочак селядцоў, 25 пудкоў ворсы) у гандляроў Андрэя Запольскага і Фрола Яновіча, якую здзяйсняў перыядычна адзін з сапегаўскіх зборшчыкаў мыт ВКЛ на Дынабургу, нейкі Калецкі ў 1605 г. і 23 лютага 1606 г. Паколькі разгляд справы зацягнуўся да 1607 г., і канчатковы вырак павінен быў адбыцца на Трыбунале ВКЛ, Л. Сапега папрасіў М.К. Радзівіла, у абмен на свае паслугі, прасачыць, каб справа вырашылася станоўча для Калецкага [17]. Толькі варшаўскі сойм 1607 г. канчаткова забараніў браць мыта са шляхецкіх тавараў у Кокенгаўзе і Дынабургу [18, с. 449]. Засталіся непарушнымі карупцыя і

злоўжыванні, характэрныя для станавага грамадства. Тыповымі з'явамі былі кантрабанда, хабарніцтва, няправільныя падлікі.

Закон аб безмытным пропуску шляхецкіх тавараў 1607 г. пачаў дзейнічаць, і ў 1616 г. камора фіксавала такі тавар і не брала з яго аніякіх збораў, аднак "прыкладка" – груз кормніка (кормчага) ці іншых паспалітых асоб, абкладалася падаткамі і мытам. Рэестр 1616 г. фіксуе наступныя выпадкі гандлю шляхты (табл. 1.).

Табліца 1 – Гандль шляхты праз Полацкую мытню ў 1616 г.

| Дата і тытул | Асоба, якой належыць тавар | Статус уласніка і накірунак пастаўкі тавара | Статус гаспадара і месца прыпіскі транспартнага сродка | Гаспадар транспартнага сродка | Колькасць стругоў | Змест тавару | Дзеянні на мытні |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 30 красавіка | Раман Марцішэвіч | Пісар Віцебскі | пана | Войны Ясінецкага | На плавіцах | Дубовыя клепкі (Wanczosu) 300, тарчаў (tarczyc) 300 | За мыта і цло плачона на каморы віцебскай Пушчаць вольна |
| 4 мая Яго міласць | Андрэй Дзевердшых | Абывацель павету полацкага дасылае да Рыгі слугу свайго Ёзэфа Грыцэвіча | Кормнік Бешанковіцкі | Цімафей Копейка | 4<br>1 | Пянькі 9 берковіцаў, а б(п)акуля (паклі) пудоў 12 ад падданых свых браў | За чыншам на цле слуга прысягу выканаў, за якую праз вольнасці шляхецкія вольна пушчана на каморы полацкай не беручы мыта, а ні старага а ні новападвышонага, а ліст е(го) м(ілас)ці пану Дзевердзічоў? Пры скрыні мытнай о(т)слал пісан в Полацку |
| 4 чэрвеня<br><br>пан | Станіслаў Лабуцкі | Фактар ямці гетмана вялькага кн літ (Яна Караля Хадкевіча) з Рыгі | Кормнік бешанковіцкі | Цімофей Копейка | 2 | Солі мехоў 85, віна амфар, шкатула запечатаная адсылаем да Полацка | На тых стругах едуць рамеснікі для ліцця дзял (гармат), ў шасці стругах. вольна пушчаем |
| 6 чэрвеня | Грыгоры Марковіч | Мешчанін быхаўскі вязе з Рыгі | Кормнік віцебскі | Стэфан Іванавіч | 4 | Перац, міндаль, мускат, поморанчаў (апельсінаў) барылка, цукра каробак 5 | Пана Адама Косава пісара віцебскага гродскага солі 12 мяхоў, меду барылка, піва бочка, віна 2 амф, селядцоў 4 бочкі, Пана Максіма ротмістра Уласовіча волава камені 16 |
| 16 чэрвеня | Е.м. пана канцлера ВКЛ (Леў Сапега) | Праз фактара свайго | | Якуб Кроп | 3 | Солі мяхоў 150, віно ам(фар) 6 | За лістам е(го)м(ілас)ті вольно пушчона ў Дынабургу |
| 20 чэрвеня Его міласць пан | Ярош Лопата | Правадзі стругі з Рыгі | Праз слугу свайго | Андрэя Пёслановіча | 22 | Солі 60 мяхоў | Ад таго досыць чыніў пану Быхаўцу у Полацку,+пудкоў 30 ад таго досыць чыніў у Дына-бургу дынам. На таго дамовы патрэбы вольно пушчона солі мяхоў 12 селядцоў 2 бочкі, віна (к)аўшы 2 |
| пан | Юры Курыловіч | Мешчанін полацкі | Правадзі з Рыгі | пры тавары пана Лопаты | | | Ад таго досыць чыніў ў Дынамбургу |
| 22 чэрвеня | Ёзеф Рохінскі | Абывацель ваяводства полацкага правадзі з Рыгі. | Кормнік полацкі | Лазар Сцебут | 11 | Попелу 6 лаштоў | Пасылаў да Рыгі прыяцеля свайго пана Гаврыіла Остафіевіча мешчаніна полацкага і слугі яго пана Войцэха Остроўскага. Якія па выкананні прысягі па вольнасцях шляхецкіх вольна пускаем. |
| 21 чэрвеня | Яраш Валовіч стольнік мсціслаўскі | Пасылае да Рыгі | Кормнік бешэнковіцкі | Цімафей Копейка | 3 | Ванчосу дошчачак 90 з пушчы сваей ўласнай | За вольнасццю шляхецкай не браць мыта новападвышонага, вольна пушчона |

Як бачым, за адзін толькі 1616 г. год магнаты (Л. Сапега, Я.К. Хадкевіч, Я. Валовіч ) і паны ВКЛ ажыццяўлялі досыць актыўны гандль па Дзвіне праз сваіх упаўнаважаных – фактараў. Уладанні якіх месціліся ў Падзвінні і Падняпроўі (Леў Сапега, Ян Караль і Аляксандр Хадкевічы, князі Сангушкі, Галоўчынскія і Саломярэцкія). Шляхта гандлявала не толькі сельскагаспадарчай прадукцыяй, але і вырабамі, якія мелі з уласных пушчаў (цёс, клёпкі, попел). Леў Сапега вышэй Полацка меў уладанні і трыманні вакол сваей роднай Астроўны і Чарэі, Лепеля, а ніжэй па плыні развіваў сваю латыфундыю з цэнтрам у Друі [19, s. 28]. У гэты ж час гетман ВКЛ Ян Караль Хадкевіч умацоўваў свае ўладанні ў Шклове і Быхаве, аб чым сведчыць фіксацыя на мытні фактарам 4 чэрвеня 1616 г. шасці стругаў з рамеснікамі для ліцця гармат (гл. табл. 1.). Найм мяшчан для транспартыроўкі і продажу тавараў ці агульныя страты, калі тавар гінуў (напр. у выніку крушэння стругаў у нізоўяў, з-за невыканання рыжанамі абяцанняў па прачыстцы рачнога фарватэра [6, с. 90]), бяспрэчна звязваў феадальнае грамадства ў адно цэлае, разам з тым станавыя межы і прывілеі сцерагліся вельмі чуйна.

Працэдура верыфікацыі прыналежнасці тавара на мытні была простай. Кормнік ці даручэнец прысягаў на словах, што тавар выраблены на продаж у гаспадарцы ці набыты на асабістыя патрэбы таго ці іншага знатнага чалавека, або паказываў пісьмовае пасведчанне ранейшай выплаты падаткаў і мытнікі “вольна пускалі” яго далей. Такая сістэма працавала, але здараліся і выключэнні. Так, анекдатычна выглядае зухвалая выхадка сына полацкага бурмістра Юрыя Фёдаравіча Хадыкі, якая прайшла яму беспакарана. 20 чэрвеня 1616 г. на полацкай каморы ён заявіў аб тым, што вязе “на яго асабістыя патрэбы каралю і яго жонцы” барылку воцата – якую мытнікі не адважыліся абкласці зборамі і прапусцілі далей [7, арк. 28 аб.].

Побач з купцамі, упаўнаважанымі асобамі і супрацоўнікамі мытні ўдзельнікамі сацыяльнай структуры гандлю былі прадстаўнікі асобнай карпарацыі: “кормнікі”, прадстаўнікі якой запісваліся на мытні з пазначэннем порта прыпіскі. Сама назва паходзіць ад слова “карма” дзе, як вядома, на стругах месцілася стырно, лаўкі для сну пад навесам (дахам) і гняздо назіральніка [1, с. 346–347][1]. Кормнікі[2] [1, с. 252] былі ўласнікамі струга ці найманымі капітанамі і лоцманамі. Яны самастойна везлі тавар або наймаліся праваднікамі стругаў і плавіц; маглі выдаваць плавучыя сродкі ў арэнду, адпраўляць сваіх даручэнцаў да Рыгі і назад. З улікам складанасці навігацыі па Дзвіне і працаёмкасці пагрузачнай і сплаўнай / цяглай дзейнасці, кормнікі і шэраговыя працоўнікі абслугі складалі досыць вялікую колькасць мяшчан, якія не ўваходзілі ў іншыя гарадскія карпарацыі. Больш таго, яны маглі нават і не жыць у горадзе. Так, у рэестры 1616 г. ёсць узгадкі аб кормніках, якія паходзілі з полацкіх прыгарадных вёсак: Шнітак (Гермаген Матысавіч) і Копцева (Федар Пранкевіч, Овсей Раманыч, Андрэй Корба), якія наняліся ў 1616 г. везці тавары галоўчынскіх купцоў [7].

Памеры артыкула не дазваляюць прывесці поўны спіс гандляроў і кормнікаў, найбольш тыповыя выпадкі прапануем ў табліцы 2.

Табліца 2 – Гандль мяшчан па Дзвіне 1616 г.

| Дата і тытул | Асоба, якой належыць тавар | Статус уласніка і накірунак пастаўкі тавара | Статус гаспадара і месца прыпіскі транспартнага сродка | Гаспадар транспартнага сродка | Колькасць стругоў | Змест тавару | Дзеянні на мытні |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 |
| 28 красавіка 1616 Пан | Максім Уласовіч | Шклоўскі мешчанін вязе ў Рыгу | Кормнік Віцебскі | Мікалай Глуховіч | 3 | Пянька 30 фунтаў, Рагожа, канаплянае насенне 120 бочак, 500 рагож, 2 камення вагай, пакля бунты (фунты?, вязкі?) два | За ўсе ў каморы полацкай разлічыўся досыць і за цло (збор) воднае і за насенне і на снасць струговую мае кормнік пянькі 11 камені. Вольна прапушчаны. Мыта не браць. |

[1] А.П. Сапуноў так апісвае струг: даўжыня 17–18 сажняў, шырыня – 5 сажняў, 1–2 аршына, вышыня – 9 чвэрцяў. Пад максімальным грузам да 12 000 пудоў усаджвалася на 5 чвэрцяў. На стругу акрамя “кормчага” знаходзіліся да 30 “сходнікаў-працаўнікоў-грузчыкаў і сплаўшчыкаў начале з “дзяцінай”, а таксама “карэнныя” (“малайцы”) грабцы-стырноўшчыкі.

[2] А.П. Сапуноў ведае толькі аб спробе Екацярыны ІІ заснаваць цэхі кормшчыкаў (“коршчыкаў” па веліжкім вымаўленні), у тым ліку на Дзвіне, але сцвярджае, што яна была няўдалай, пра ранейшыя часы яму нічога не вядома, хоць ён і сцвярджае, што лоцманскія веды аб парогах і навігацыі передаваліся з пакалення ў пакаленне.

Працяг табліцы 2

| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Пан | Іван Семеновіч | Мешчанін з Дуброўна | Кормнік Віцебскі | Дзямешка Дзянісавіч | 2 | Пянкі 19 бунтоў, пакля палова 150 камені | 12 марца ў годзе цяперашнім 1616 на прыкаморку аршанскім у Дуброўне, на што квіт выданы з номерам 29 з подпісам рукі яго міласці Гераніма Цехановіча, которы тавар вольна пушчаць |
| Пан | Сямен Мацюшэвіч Даўгяла | Мешчанін віцебскі | Сам кормнік | | 3 стругі і 1 "палавіча" | 16 фунтаў пянькі 320 рагож, 50 бочак насення канаплянага, 14 лаштоў попелу | Аплочана на прыкаморку Дубровенскім. Вольна прапусціць |
| 5 мая пан | Дорофей Семеновіч | Мешчанін Чарэйскі да Рыгі | Кормнік полацкі | Лазар Сцебут | 1 | 19 бунтоў пянькі 10 бочак гарэлкі 1000 кварт | за мыто новападвышонае у Полацку заплаціў |
| Пан | Ян Дзягілевіч | падпісак земскі полацкі | Кормнік полацкі | Яська Савіч | 1 | Пянька, канапля, пакля | За цло воднае па капе у каморы полацкай |
| 22 мая першае вяртанне з Рыгі | Максім Уласовіч | Мешчанін шклоўскі | З Рыгі кормніка віцебскага | Мікалая Бухновіча ? | 3 | 60 мяхоў солі,, 2 лашты селядцоў, 3 лашты воцату, 2 віна, = | кормніцкага мяхоў 30 солі На каморы полацкай падаткаў 124 чатвертакі |
| | Якаў Федаравіч | Мешчанін полацкі | Кормнік полацкі | Алексей Гурыновіч | 2 | Солі 73 мяхі, розынак вялікіх 2 бочкі, фіг – барыла, мікатаў (мускатаў) – 2 фунты, імбіра 20 фунтаў, 3 фунты гваздзікоў, серы 20 фунтаў, 4 рэзы паперы, 6 пудкоў перцу | Прыкладу кормніка: воцату 1 бочачка, селядцоў 6 бочак, 1 бочка піва. Забралі 80 пудкоў солі, селядцоў асмінку. |
| 24 мая пан | Федар Лазаровіч | Мешчанін полацкі | Кормнік полацкі | Карп Степанавіч | 2 | Солі мяхоў 78, сялядцоў 8 бочак пудкоў 100, павінен адаць у Полацку | За тое ў Дынамборку досыць чыніў вольна пушчона яго. |
| пан | Гардзей Юркавіч | Мешчанін полацкі | Кормнік полацкі | Андрэй Косцьковіч | 3 | Солі 96 мяхоў, селядцоў 3 лашты, 50 штаб жалеза, 8 пудкоў перцу | У каморы полацкай мыта нам пудкоў солі 100, частку ад таго даў на мытні дынабурскай |
| пан | Шчасны Марціновіч | Мешчанін полацкі | Кормнік полацкі | Іван Беднік | 1 | 38 мяхаў солі, 38 бочак селядцоў | Ад таго даў тут 37 пудкоў рэшту ў Дынабургу учыніў |
| 28 мая пан | Остафей Сцепанавіч | Мешчанін полацкі | Кормнік полацкі | Юхна Анціпавіч | 4 | Соль 170 мяхоў, віна 2 окы (амфары?), меду 2 барылкі, малвазіі барылак 2 | |
| 30 мая пан | Раман Петровіч | Мешчанін полацкі | Кормнік полацкі | Опанас Нікіпоровіч | 3 | Соль, селядцы, разынкі 6 бочак, перцу 10 пудкоў, анісу 10 пудкоў, олава чвартка, мігдалаў 1 пудок, цынамону 2 фунты, воцату бочка | |
| 11 чэрвеня пан | Іван Маляўка | Мешчанін талочынскі | Кормнік чашніцкі | Скарына | 1 | Соль 35 мяхаў, селядцоў 6 бочак | Ад таго досыць чыніў у Дынабургу. |

Працяг табліцы 2

| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 17 чэрвеня пан | Петр Романоўскі | Мешчанін чашніцкі | Кормнік чашніцкі | Станіслаў Малафеевіч | 3 | Соль, селядцы, віна 6 амф, | прыкладкі: Соль, селядцы, на патрэбу князю ковельскаму (Сангушка) жалеза штаб 12, шкла скрыня, перцу пудкоў 5, розынак кошык, олівы барылка то вольно пушчона з полацкай каморы. |
| 20 чэрвеня | Купрыян Нікіфаравіч з таварышамі сваімі | Мяшчанін з Баркулабава вязе з Рыгі | Кормнік полацкі | Грышка Лукіс (!) | 10 | Солі 390 мехоў, суна карозей паставоў 20, сукна мурлавскего (мараўскага) 1 паставоў, кірж 4 паставы, разынак 4 кошы, в ніх вага камень 6, арэхаў влоскіх 2 бочкі. | Правозіць на свае прыкладкі кормніцкія солі 3 меха, ад таго досыць у Дынабургу пудкоў 250, на свае потрэбы 10 мяхоў солі Богдану Соломерецкому на его дамовыя патрэбы пушчона вольна, куражы паставоў 16 і кужу паставоў 4 |
| пан | Юры Федаравіч Ходыка | Бурмістровіч полацкі | Пры тавары пана Купрыяна на стругах кормніка полацкага | Грыгора Лакіса (відавочна, той самы чалавек і стругі, але напісанне прозвішча рознае) | | Рыбы кіпкі (кучкі) 2 невялікіх, падлешчыкаў 1000, разынак 4 кошы, сялядцоў асмінку, скур ласіных 3, насення цыбульнага2 камені | Паведаў камень 2 ад тога досыць чыніў крулове на яго паніў у Дынабургу, + самаму крулове на яго патрэбы воцата барылка вольна пушчона |
| 20 чэрвеня 22 чэрвеня другое пайсцё ў Рыгу | Спірыд Кондратовіч | Мешчанін полацкі | Настугу прожным праз кормніка полацкага | Якуня Гурыновіч | 1 | Гарэлкі 2 бочкі, у ніх кварт 600, мыла таблічак 400 | В подазку вязе купцу рыскаму ланс-коп 52\34\71 |
| | Іван Фількові ч | Мешчанін полацкі | Провадзі да Інфлянт на стругу прозным | кормнік полацкі Якуня Гурыновіч | 1 | Гарэлкі 3 бочкі 900 кварт | Учыніў у Полацку, на расход у дарозе гарэлкі барыла 4 з ротку коп 3 |
| | Якаў Мядзведзь | З Бешанковіч | Провадзі да Рыгі на стругах прожніх | кормнік бешанковіцкі Алексей Віцеблянін | 2 | попел, пакля | |
| 21 чэрвеня | Васілі Прокуда | З Бешанковіч | Кормнік бешанковіцкі | Нікіфор Копейкі | 5 Прозных | Ванчосу 100 (дубовых клепак) | Ад таго на каморы полацкай |
| 22 чэрвеня | Карміло Грунька | Мешчанін віцебскі | Кормнік віцебскі | нагружаны праз Савосціяна Войцеховіча | 4 | попел, пакля, рагожы, попел, мыла маскоўскага касякоў 48, ён жа мае скур конных 200, падцялковах 50, яловічых 10, обойкаў 30 | Тавар адпобораваны ў Віцебску 10 мая 1616 г. праз пана Алексея Ш(П)еренова |
| 28 чэрвеня | Мікалай Клаўс Пентоў | Мешчанін шклоўскі | Пасылае да Рыгі праз чэлядніка свайго Фабіана Фішэра | Кормнік віцебскі Азар Вой(!)л | 4 | Попел лаштоў 11 бочак 6 | Адпабараваны у Рэчыцы 2 квітамі, 1-1 мая №2, а 2-квіт 25 чэвеня №10 дадаў лашт, за што учыніў досыць на каморы полацкай |

Працяг табліцы 2

| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 28 чэрвеня | Роман Петровіч | Мешчанін полацкі вязе ў Рыгу | наладаваных (нагружаных) праз кормніка полацкага | Карп Бібенка | 3 | Пянькі прывазной з Копысі бунтоў 61, вага 1220 каменяў, паклі 2 бунты вага 40 каменяў | За тое ўсе ў каморы полацкай плачона |
| 8 ліпеня | Пашлі да Рыгі два стругі п(а)-рожных | Пана Шчас-нага Роготня, з Полоцка | Кормнік полацкі | Кондрат Першонак | 2 | | |
| Рэестр пав-рацэнія дру-гога пуця з Рыгі 23 юлі 18 ліпеня | Лук'ян Бука | Мешчанін віцебскі | Сам кормнік | | 4 | Соль мяхоў 138, сялядцоў 15 бочак, 2 чвэрткі фіг. | Ад таго на каморы полацкай 135 пуд-коў, досыць учы-ніў. |
| 8 жніўня | Семен Даўгяла | Мешчанін віцебскі | Сам комнік | | 4 | Солі 138 мяхоў, віна 2 аўкшты, воцат | У рэестры паметка што мыта тут і далей бярэцца на Дзісне [7, арк.33] |
| 9 жніўня | Якаў Ларкевіч | Мешчанін віцебскі | Кормнік віцебскі | Марцін Захарін | 13 | Соль, селядцы, сук-но кароз'і 20 пас-тавоў і гд. | |
| 18 жніўня | Лукаш Юр'евіч | Мешчанін полацкі | Кормнік полацкі | Іван Кубля | 4 | Соль128 мяхоў | |
| | Цімафей Іванавіч | Мешчанін полацкі | Кормнік полацкі | Грыгор Харытона віч | 4 | Соль 122 мяхі, се-лядцы 24 бочкі | |
| пан | Якаў Медзьвед зь | З Бешанковіч | Кормнік бешанковіцкі | Алексей Івановіч | 4 | Соль, селядцы, (кл) хавішу (?) 75 пуд-коў, сукна кароз'і 2 поставы | |
| 23 жніўня | Гардзей | Мешчанін полацкі | Кормнік бешанковіцкі | Цімафей Капейка | 4 | Соль 140 мехоў | |
| 20 жніўня | Спірыд (?) Кондрато віч | Мешчанін полацкі вязе ў Рыгу | Настугу прожным праз кормніка полацкага | Якуня Гурыновіч | 1 | Гарэлкі 2 бочкі, у ніх кварт 600, мыла таблічак 400 | В подачку вязе купцу рыжскаму ланс коп 52\34\71 |
| пан | Іван Фількoвіч | Мешчанін полацкі | Провадзі да Інфлянт на стру-гу прозным кор-мніка полацкага | Якуня Гурыновіч | 1 | Гарэлкі 3 бочкі 900 кварт | Учыніў у Полацку, на расход у дарозе гарэлкі 4 барылы з ротку коп тры. |
| 26 жніўня | Клаўс Пентоў | Мешчанін шкловскі | Кормнік віцебскі | Озар Войлов (!) | 4 | Соль, віно | На Дысне |
| 30 жніўня трэцяе пойс-цё ў Рыгу пан | Федар Ла-заровіч з таварыша мі яго | Мяшчане полацкія | Кормнік віцебскі | Лук'ян Бука | 5 | Пянька чыстая 68 бунтаў, пакля бун-ты 4 | У Полацку аплаціў. Прыкладу свайго мае попелу 2 лашты |
| пан | Андрэй Лук'яна-віч | Мешчанін віцебскі | Прожнія стругі | | 2 | Пянька, скур канін і падцялковых 100, козлін 50, яловічых скур 20 | |
| пан | Якоў Мацюшэ-віч | радца мяста полацкага | Кормнік полацкі | Омільян Мікітініч | 2 | Попел, пянька, ле-ну фас 5, камені 5 , 130 з каторага ад-паборовано ў Магі-леве камней 20, квіт № 15, насенне кана-плянае 16 бочак. | |
| 11 верасня пан | Грыгоры Юркoвіч | Полачанін | Да Рыгі нагру-жоных Корм-нікам полацкім | Алексы Хухыно-віч? | 4 | Пянкі бунтоў 49, паклі бунты 3, на-сенне канаплянае 10 бочак, шкур падцёлкавых 40, воску смальцава-нага (тапленага) 7 плашлак малых, асобна воску сырцу камнеў 2, усяго воску 10 камнеў | Прыклады корм-ніка полацкага Ка-рпа Стэфановіча Озгі за 3 копы, 8 пудкоў яму вольна пусціць бо веле заплаціў на каморы полацкай мы нато 28 мая выклікала велькія купцові ўпадкі таму – воль-на пушчона |

Заканчэнне табліцы 2

| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 11 верасня пан | Ламберт Вестер-ман | Мешчанін шклоўскі | Слугу свайго Ежага Фрэдара на стругу корм-ніка віцебскага | Маклеж? Махера? Быкоўска-га | 1 | Попела бочак 8, 4 лашты | на цле новапад-вышоным вольна пушчона, безмыт-не. То в награду яму чынена, што з першым яго пуй-сем у Рыгу з тава-рам яму се упу-сціла. Пусціце во-льна. Пісан ў По-лацку |
| пан | Петр Федаравіч | Войт чарэйскі | Кормнік полацкі | Лазур Сцебут | 2 | Пянькі 2 фунты, паклі 1 фунт, на кроўлі скур пад-цялковых 42 | вольны цяпер |
| пан | Якаў Мацюшэв іч | Радца мяста полацкага | Кормнік полацкі | Омільян Мікітініч | 2 | Пянька, пакля, ле-ну фасаў 5, камені 5, 130 з каторага адпаборавана ў Магілеве: камней 20, № 15, насенне канаплянае 16 бо-чак | |
| [7, арк. 43] 11бра (верасня) Пан | Якуб Юр'еў | Радца места полацкага | Кормнік полацкі | Іван Кубля | 2 | На каморы полац-кай 50 бочак, 24 камнеў, і бунт 1 пянькі вагой 25 ка-мені, в розвежы пакля камені 86, воску кружок, ва-гой 2 камені | Од таго нам до-сыць ў Полацку ўчынена пісана ў каморы Полацкай |

Як бачым, абарот з Полацка на Рыгу і назад складаў каля месяца, за навігацыйны год рабілася па некалькі рэйсаў. Асаблівай сезоннай і рэгіянальнай розніцы ў наменклатуры тавараў, якія пастаўляліся ў Рыгу з Полацкага ваяводства і з іншых беларускіх земляў не было. Асноўнымі экспартнымі таварамі былі пянка, пакля, рагожы, канаплянае насенне, гарэлка (бочкамі ў 200–400 кварт), попел, воск; зрэдку лён, мыла, футры, дубовыя клёпкі на бочкі (ванчос) і донцы (тарчыцы) з пушчаў шляхты. Вясной да стругаў чапляліся плавіцы (плыты), а ў жніўні – верасні да экспартных тавараў дадаваліся скуры і футры (яловіц, лосей, коней, падцёлкавыя, казлоў). Адметна адсутнасць сярод вывазных тавараў збожжавых культур і прадукцыі пчалярскага промыслу, акрамя воску.

Адсутнасць харчавання сярод эспарту тлумачыцца не толькі спецыялізацыяй рэгіянальнай эканомікі пад профіль рыжскага гадлёвага порта [12], але і вайной з Масквой 1609–1618 гг. У 1616 г., за выключэннем адзінкавай згадкі пра мыла, іншых “маскоўскіх” тавараў рэестр не фіксуе, хаця яшчэ ў 1605 г. ішоў актыўны рээкспарт футраў, фарбаваных скур, палотнаў і г.д. [1, с. 296.]. Адносная нешматлікасць (ад 1 да 10 стругаў у кожным водным гандлевым караване) у 1616 г. была выклікана спусташальнымі набегамі маскоўскіх войскаў у ваколіцы Полацка (падчас аднаго з якіх “адных Корсакаў да кільнанасту (ад 10 да 20) забілі”) [20], спаленнем і абрабаваннем зімой 1613–1614 гг. ваколіц Чарэі, Бешанковічаў, Оршы і Мсціслава [20]. Аднаўленне страт пасля шматлікіх войнаў патрабавала часу, таму зусім не выпадкова, што ў агульным аб’ёме гандлёвых караванаў, якія прайшлі праз Полацкую мытню ў 1616 г., дамінавалі стругі, зарэгістраваныя на Віцебскіх і Чашніцкіх кормнікаў.

Блізасцю да тэатра баявых дзеянняў, рабаўніцтвам чужынцаў і небяспекай ад уласных дэзерціраў і “падшыванцаў” пад жаўнераў можна патлумачыць фактычную адсутнасць наземнага перасоўвання твара праз Полацкую мытню. Рэестр мытных квітоў 1616 г. зафіксаваў толькі адзінкавы за год выпадак (!) прывозу палачанінам Ігнатам Пятровічам на вазе футраў (сабалёў, ліс, норак, выдраў) з Наваградка 30 траўня 1614 г. [7, с. 18]. Ёсць усе падставы пагаджацца з існаваннем сухапутнага гасцінцу да Рыгі летам, а зімой – саннага па лёдзе Дзвіны, аднак рэестр мыта 1616 г. гэтага не пацвярджае.

У імпарце з Рыгі ў глыб кантынента суцэльна дамінавалі соль і селядцы. Кожны гандляр вез іх з Рыгі. Далей па папулярнасці ішлі разынкі, фігі, воцат, віно (французкае, італьянскае, крыцкае (крэта), малвазія), пітны мёд, радзей – піва. З нехарчовых тавараў масава ўвозілі шкло, жалеза, волава, свінец, сукно (карозія, англійскае, кірж), ворсу (распушчаныя і пасечаныя на кавалкі рэшткі старога пяньковага такелажу для фітылёў), адзін раз фіксуюцца паясы і папера.

Беларускія мяшчане пачатку XVII ст. ведалі і ўжывалі спецыі і экзатычную садавіну: аніс, перац (ядрамі і пукамі), міндаль, цынамон, мускат, цукар, кмін, влоскія (грэцкія) арэхі, аліву (аліўкавы алей), помаранчы (апельсіны), лімоны. Таксама сустракаюцца себас (лаўрак – марская рыба), рыс, цукар, невялікія падлешчыкі, цыбуля-сявок.

Шырока вядома, што ў ранні Новы Час маркерам прыналежнасці да гарадской вярхушкі былі прыдомкі "славетны" перад пасадай (напрыклад, райцы, лаўніка ці бурмістра), а звароты "пан", "ягомосць", "ваша міласць" ужываліся адносна прадстаўнікоў шляхецкага стану. Цікавай асаблівасцю мытнага рэестра 1616 г. з'яўляецца зварот да мяшчан, прычым, рознага статусу праз "пан", зварот гэты сустракаецца і ў іншых дакументах, але тут ён вельмі масавы і адносіцца як да кіраўнікоў цэлых рачных флотаў, так і да саматужнікаў на адным стругу. Рэестр мытных квіткоў 1616 г. утрымлівае шэраг імёнаў прадстаўнікоў кіруючых колаў беларускіх гарадоў: полацкія бурмістры: Мелешко Семеновіч, Остафей Пятровіч і "бурмістровіч" Юры Федаравіч Хадыка, радцы – Якаў Мацюшэвіч, Лукаш Юрьевіч, Якуб Юр'еў (ён жа Якуб Юр'евіч), Жук (?) Яновіч і лаўнікі – Станіслаў Станіслававіч і Цімафей Іванавіч; бурмістры віцебскія – Петр Іванавіч і Навум Воўк, чарэйскі войт Петр Фёдаровіч [7].

Антропанімічную інфармацыю, якая дазваляе праліць пэўнае святло на этнічны і рэлігійны склад насельніцтва беларускіх гарадоў можна атрымаць па іменах, зафіксаваных у рэестры. Сярод старaславянскіх імёнаў, імёнаў па-бацку і мянушак (Гардзей, Хацян, Сіла, Акула, Мікіцініч, Розумовіч, Мядзьведзь) і праваслаўных (Іван, Осіп, Астафей, Дарафей, Сцяпан) сустракаюцца ўжо дастаткова шматлікія заходнія (каталіцкія) імены (Ян, Стэфан, Шчасны (Феликс) Марціновіч) і балцкага паходжання (Локіс/Лакіза, Дашко Сулімонавіч, Матыс Улаховіч).

Дакумент сведчыць аб актыўнай дзейнасці нямецкіх купцоў і арэндатараў, якія знайшлі спосаб абыходзіць забарону на гандль уніз па Дзвіне за Полацкам, прапісаны ў гарадскім магдэбургскім прывілеі і законах ВКЛ, пачынаючы з Вітаўта. Яны станавіліся мяшчанамі беларускіх гарадоў, а потым выкарыстоўвалі сваіх супляменнікаў у якасці даручэнцаў і мясцовых кормнікаў для транспартыроўкі тавараў. Напрыклад, быхаўскі мяшчанін Мікалай Клаўс Пентоў "праз чэлядніка свайго Фабіана Фішэра" фіксаваў на полацкай мытнай каморы груз попелу ў 11 лаштоў і 6 бочак, якія вёз у Рыгу на 11 стругах віцебскага кормніка Лазура Войла [7, арк.32]. Запісаны мытнікамі як рыжанін Эверт Карплоў [21][3] праз сваіх даручных Ханса Скоркіна і Курта аформіў бязмытны пропуск каравану ў 8 стругаў з ляснымі таварамі, які яму сплаўлялі віцебскія кормнікі Міхал Каваль "з таварыствам" [7, арк. 38]. Але найбольш актыўным з немцаў быў шклоўскі мяшчанін Ламберт Вестерман (6 узгадак), які афармляў на полацкай мытнай каморы тавары з верхняга Падзвіння і Падняпроўя. Так, 6 мая ён запісаў у мытны рэестр на сябе найбольшы з зафіксаваных у 1616 г. караванаў з 34 стругаў і 11 плавіц з грузам пянькі і попелу, 269 лаштоў, якія вялі да Рыгі віцебскія кормнікі Якуня Бука, Багдан Федаровіч, Дуйскія, Федар Лапа, Іван Рачковіч [7].

Цікава таксама і наяўнасць у рэестры "старазапаветных" імён, якія маглі належаць прадстаўнікам юдзейскага паходжання. Але, што хутчэй за ўсе, паколькі для гэтага народу існавала забарона сяліцца на тэрыторыі Рыгі, Інфлянтаў і Віцебска, ды і ў Полацку яны толькі пачалі з'яўляцца пасля разні, учыненай Іванам Жахлівым ў 1563 г, старазапаветныя імёны маглі ўжываць мясцовыя немцы, пратэстанты ці праваслаўныя (галоўчынскі мяшчанін Моісей Дземідовіч, мяшчане полацкія Ісак Іванавіч і Еш(с)ка Броўка, кормнікі полацкія Ісак Федаравіч і Ізак Міхайлавіч). Толькі адзін раз сустракаецца ўзгадка аб кормніку чашніцкім Аўдзеі Татарыне, які верагодна меў татарскія карані [7].

Адносна гандлевага абшару полацкага гандлю мытны рэестр 1616 г. дазваляе казаць аб працягу існавання ў пачатку XVII ст. скарочанага днепра-дзвінскага воднага шляху ў межах ВКЛ. Найбольш паўдневым мытным таварам, які прайшоў праз полацкую камору на Рыгу ў 1616 г., былі тавары з Рэчыцы (кіяўлян і іншых жыхароў ніжняга Падняпроўя не фіксуецца), найбольш усходнім – з Веліжа і Смаленскіх пушчаў. Шырока выкарыстоўвалася рачная сетка і возеры Падзвіння, што спрычынілася да стварэння дастаткова трывалых партнерскіх адносінаў паміж кормнікамі і гандлярамі пэўных рэгіёнаў. Палачане звычайна карысталіся паслугамі сваіх землякоў або жыхароў бліжэйшай ваколіцы (Дзісна, Чашнікі, Бешанковічы). Купцы з Лепеля, Сянна, Лукомля звычайна наймалі стругі ў Чашніках і Бешанковічах, жыхары Падняпроўя (Орша, Шклоў, Дуброўна, Копысь, Галоўчын, Баркулабаў, Магілёў, Быхаў, Рагачоў, Рэчыца) для экспарту сваіх тавараў часцей за ўсё выкарыстоўвалі стругі з Віцебска, Чашнікаў, Бешанковіч і Полацка. Віцебскую прыпіску мелі каля 30%, чашніцкую – каля 28%, полацкую – каля 25% бешанковіцкую – каля 10% стругоў і плытоў, зафіксаваных на полацкай мытні ў 1616 г. [7].

**Высновы.** На самым пачатку ўвядзення ў практыку падатковага імунітэту для шляхты асаблівай перавагі над купецтвам у памерах яе тавараздвароту не было. Як не было і жорсткага замацавання тэрміну "пан" выключна за высакародным станам. Мяшчане буйных гарадоў рознага сацыяльнага статусу ка-

[3] Рыжскія фактары Э. ван Карпэн, М. і Б. Любарты пазычылі РП на вайну за Смаленск 1609–1611 гг. 7000 злотых, за што атрымалі ў арэнду смаленскія пушчы на 1611–1615 гг., прычым падаткі з выраблених і сплаўленых па Дзвіне лясных тавараў ішлі ў скарб ВКЛ .

рысталіся гэтым прыдомкам у афіцыйным дакументазвароце. Практыка станавай прывеліяванасці шляхты выклікала незадаволенасць мяшчан, якая праяўлялася і ў судовых спрэчках, і ў выпадках жартаўлівага прыпісвання каралю падакцызнага тавару. Хаця полацкія гандляры і кормнікі ў першай чвэрці XVII ст. па прычыне ваеннных вынішчэнняў ужо страцілі першынство ў Дзвінскім гандлі на карысць віцяблян, але яшчэ засталіся сярод яго лідараў, спраўна задавальняючыя патрэбы знешняга (у пяньцы, паклі, рагожах, скурах, гарэлцы) і унутранага рынку (солі, рыбе, спецыях, віне). Развітыя сувязі паміж гандлярамі, мяшчанствам і шляхтай Падзвіння і Падняпроўя стварылі адзіны эканоміка-культурны рэгіён, які прыблізна ў пачатку XVI ст. і пачаў называцца ў пісьмовых крыніцах Белай Руссю.

ЛІТАРАТУРА

1. Сапунов, А.П. Река Западная Двина / А.П. Сапунов. – Витебск: Типо-Литография Г.А. Маркина, 1893. – 640 с.
2. Копысский, З.Ю. Экономическое развитие городов Белоруссии в XVI – первой половине XVII в. / З.Ю. Копысский. – Минск : Наука и техника, 1966. – 227 с.
3. Копысский, З.Ю. Социально-политическое развитие городов Белоруссии в XVI – первой половине XVII в. / З.Ю. Копысский. – Минск : Наука и техника, 1975. – 193 с
4. Мелешко, В.И. Могилев в XVI середине XVII в. / В.И. Мелешко. – Минск : Наука и техника, 1988. – 264 с.
5. Мялешка, В. Камора / В. Мялешка // Вялікае княства Літоўскае : энцыкл. : у 3 т. / рэдкал. Т.У. Бялова (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск, 2007. – Т. 2. – С. 26–27.
6. Дорошенко, В.В. Торговля и купечество Риги в XVII в. / В.В. Дорошенко. – Рига : Зинатне, 1985. – 350 с.
7. Бібліятэка Віленскага універсітэта (VUB). – F4 – 13162. Рэестр прад'яўлення квітоў каморы Полацкай 1616 г.
8. VUB. – F4 – A1670 Рэестр мыта старога каморы Гродзенскай 1600 г.,
9. VUB. – F4 – A1590 Рэестр мытных квітоў каморы Гродзенскай 1590 г.,
10. VUB. – F4 – (A233) 1360 Рэестр мыта старога Берасцейскай каморы 1605 г.
11. Острога, В.А. История таможенного дела и таможенного права Беларуси : учеб. пособие / В.А. Острога. – Минск : БИП-С, 2005. – 192 с.
12. Якубаў, В.У. Рыга / В.У. Якубаў // Вялікае княства Літоўскае : энцыкл. : у 3 т. / рэдкал. Т.У. Бялова (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск, 2010. – Т. 3. – С. 385–388.
13. Рэвізія полацкага ваяводства 1552 г. / уклад. В.В. Варонін. – Мінск : Архэ. пачатак, 2011. – 271 с.
14. Катлярчук, А. У ценю Польшчы і Расеі. Вялікае княства Літоўскае і Швэцыя ў часе эўрапейскага крызісу сярэдзіны XVII ст. / А. Катлярчук // Архэ. Пачатак. – 2008. – № 7–8. – С. 366–680.
15. Якубаў, В.У. Сапегі ў барацьбе Жыгімонта Вазы за шведскую карону 1594–1611 гг. / В.У. Якубаў // Леў Сапега (1557–1633) і яго час : матэрыялы міжнар. навук.-тэарэт. канф., Гродна, 4–5 крас., 2007 г. / М-ва адукацыі Рэсп. Беларусь, УА Гродз. дзярж. ун-т імя Я. Купалы ; рэдкал.: С.В. Марозава [і інш.]. – Гродна, 2007. – С. 143–149.
16. Scriptores Rerum Polonicarum / wyd. ks. A. Sokołowski. – Kraków : Nakładem ks. A. Radziwiłła drukarnia W. Anczyca i Spolki, 1885. – T. VIII : Archiwum domu Radziwiłłów. Listy ks. M.K. Radziwiłła, Jana Zamojskiego, Lwa Sapiehy. – 295 s.
17. Бібліятэка Літоўскай Акадэміі Навук імя Ўрублеўскага (LMAVB) – F.9. b.431 (Лісты Льва Сапегі да Радзівілаў 1600 – 1615 гг.). Ліст Льва Сапегі да М.К. Радзівіла 23 красавіка 1607 г. – С. 95.
18. Volumina legum : w 9 t. / nakladem i drukiem Jozofata Ohryzki. – St. Petersburg : Przedruk zbioru praw staraniem xx. pijarow w Warszawe, od roku 1732 do roku 1782, wydanego, Drukarnia J. Ohryzki, 1859. – T. II : Ab anno 1550 ad annum 1609. – 482 s.
19. Inglot, S. Sprawy gospodarcze Lwa Sapehy / S. Inglot. – Lwów : Naklad Wydawnictwa Polskiego, 1939. – 129 s.
20. LMAVB. – SKF 139 – 366 № 9 Андрэй Пукель да Яна Караля Хадкевіча 5.01.1514 з Быхава.
21. Метрыка ВКЛ. Метрыка прывілеяў караля Жыгімонта Вазы, канцлера ВКЛ Льва Сапегі 1599–1614 гг. // Нацыянальны Гістарычны Архіў Беларусі. – Ф. КМФ–18. Воп. 1. Спр. 86. – С. 841–843.

*Пастуніў 22.03.2016*

## TRADE AND TAXATION ALONG THE DVINA IN THE EARLY XVII CENTURY

***V. YAKUBAU***

*The article is devoted to trade and taxation burghers and the nobility of the Belarusian region over Dvina and Dnieper on the way back and forth to Riga. On the foundation of primary sources is analyzed export and import turnover content, the social status of the participants in trade. The conclusion about the decline of Polotsk river fleet, the relative equality of the size and the range of gentry and bourgeois trade of goods, the use of the term "pan" with respect to the middle class and the existence in the 17th century. tight relationship between the pilots of Polotsk, Vitebsk, Chashniki and merchants from Lepel, Orsha, Shklov, Mogilev, Rogacheu, Rechitsa, which was one of the reasons for the region's residents belarusian consciousness.*

***Keywords**: trade, taxation, the Dvina region.*